Дзяржаўная ўстанова адукацыі
«Грыцкевіцкая сярэдняя школа»

# У сялянскай хаце
(канспект занятку ў II рознаўзроставай групе
па адукацыйнай галіне “Дзіця і грамадства”)

Сяргей Алена Вячаславаўна
сярэдняя спецыяльная адукацыя
1 кваліфікацыйная катэгорыя

 аг.Грыцкевічы, 2022

Праграмны задачы: 6-7г.: фарміраваць *(*развіваць)* уяўленне дзяцей аб унутраным выглядзе сялянскай хаты, аб размяшчэнні лавак, паліц, печы, аб іх прызначэнні для людзей, аб значымасці, аб прадметах дамашняга абіходу: гліняным і драўляным посудзе; фарміраваць *(*развіваць)* уяўленні дзяцей пра гістарычны быт беларусаў; фарміраваць *(*развіваць)* уменне расказваць прыказкі і прымаўкі, калыханкі, фарміраваць *(*развіваць)* уяўленні дзяцей пра гістарычны быт беларусаў, пра культуру народа, далучаць дзяцей да беларускай нацыянальнай спадчыны сродкамі вуснай народнай творчасці; развіваць памяць, мысленне, уяўленне,выхоўваць нацыянальную самасвядомасць, любоў да Радзімы; 4-5г.: фарміраваць уяўленне дзяцей аб унутраным выглядзе сялянскай хаты, аб размяшчэнні лавак, паліц, печы, аб іх прызначэнні для людзей, аб значымасці, аб прадметах дамашняга абіходу: гліняным і драўляным посудзе; фарміраваць уяўленні дзяцей пра гістарычны быт беларусаў; 3-4г.: фарміраваць уяўленне дзяцей аб унутраным выглядзе сялянскай хаты, аб рэчах, якія знаходзіліся ў ёй; фарміраваць уяўленні дзяцей пра гістарычны быт беларусаў.

Ход занятку

Дзеці з выхавальнікам заходзяць і вітаюцца.

Гаспадыня:

Я сардэчна ўсіх вітаю,
Да сябе вас запрашаю.
Праходзьце, не саромейцеся,
З маёй хатаю знаёмцеся!

Выхавальнік: Сёння мы з вамі вярнуліся ў мінулае і апынуліся ў беларускай хаце.

Гаспадыня: Я, гаспадыня гэтай хаты. У маёй хаце шмат цікавых і незнаёмых для вас рэчаў і я вас з імі пазнаёмлю.

Вось так выглядае сялянская хата беларуса.

Як вы думаеце, што займала галоўнае месца ў хаце? (Печ)

Што вы ведаеце пра печ?

Што робяць у печы?

Пра печ у народзе казалі: “Ласкавая матуля”. Яна была галоўнай у хаце, бо ў ёй пяклі хлеб, штодзённа гатавалі ежу, на ёй спалі, сушылі вопратку, абутак, ад яе было цёпла ў хаце.

Паслухайце, як у народзе гаварылі пра печ:

Ой ты, печка -сударыня,
Дапамажы нам баярыня,
Ты звары, спячы,сагрэй, асвяці,
Палячы, у хату багацце прынясі.

Выхавальнік: Паважаная гаспадыня, а гэта праўда, што печ нават лячыць можа?

Гаспадыня: Так, печка лячыла: калі чалавек прастуджваўся, дык лез на печ, праграваўся там, і хваробу як рукой знімала. Печ сагравала. А колькі казак яна апавядала доўгімі зімівымі вечарамі…

Выхавальнік: Што, печ сама казкі расказвала?

Гаспадыня: Узімку былі вельмі доўгія вечары. Ды вось бяда, святла не было.У хаце запальвалі лучыну. Лучына – гэта тонкая шчэпка, часцей за ўсё з хвойнага дрэва, якую палілі, каб асвяціць памяшканне. Пазней у дамах паявіліся керасінавыя лямпы. Дзеці сядзелі на печы, дарослыя каля печы. Адзін аднаму яны распавядалі казкі, байкі, гісторыі з жыцця. Дзеці любілі браць з сабой на печ ката і гуляць з ім. Дзеткі, а давайце і мы пагуляем.

Прапаную беларускую народную гульню "Хустачка"

Гаспадыня: Малайцы, добра пагулялі. Прысядзьце на лавачку.

Выхавальнік: Паважаная гаспадыня, а што гэта за ложачак у вас тут вісіць?

Гаспадыня: Раней не было ў дзетак ложка, каля печы вешалі вось такія калыскі. Лямпа свеціць, а матуля спявае калыханку свайму дзіцятку.

Паслухайце, якую калыханку спявалі

Люлі-люлі люляшу, Я дзіцятка калышу, Нітачку звіваю, Песеньку спяваю. Што выведу нітку Камару на світку Астануцца кончыкі Камару на штончыкі

Выхавальнік: Нашы дзеці таксама ведаюць калыханкі. Паслухайце.

Дзеці расказваюць.

Гаспадыня: Я вельмі люблю сваю хату. Лепш нічога няма свайго роднга вугла.

Беларускі народ з вялікай павай адносіцца да сваёй хаты. Пра хату ў народзе складзена шмат прыказак і прымавак. Яны адлюстроўваюць мудрасць народа, жыццёвы вопыт, яго мудрасць. Паслухайце:

- Свая хатка як родная матка.
- Слаўна хата не вугламі, а пірагамі.
- Дома і вуглы памагаюць.
- Для ўсякай птушкі сваё гняздо міла.
- Чужая хата не грэе.

Гаспадыня: Вось малайцы якія.

Выхавальнік: Раскажыце нам калі ласка што ў вас гэта за палічкі?

Гаспадыня: Гэта лавы: дубовыя, добра ўмацаваныя, шырокія. Паглядзіце на іх, яны падобныя ці адрозніваюцца? Канечне адрозніваюцца. Вось у гэтай лавы няма ножак. Яна мае назву крама. Раней у у дамах жыло многа людзей. Спалі на ложках, на печы і нават на лаўках. А гэта - паліца. Яна зроблена з габляваных дошак, прымацаваная да сцяны. На ёй стаяць рэчы, неабходныя для гаспадара. Насупраць печы знаходзіцца бабін кут. Тут рыхтуе есці гаспадыня. Вось тут вісіць паліца. На ей стаіць гліняны посуд, неабходныя рэчы ў гаспадарцы.

Вось гляк. Гэта гліняная пасудзіна для захоўвання і рэчываў — алею, квасу, вады.

А гэта збан, спецыяльны гліняны посуд з выцягнутым тулавам, пукатымі бакамі, звужаным горлам, дзюбай-літком і вушкам-ручкай. З’яўляецца ганчарным вырабам. Выкарыстоўваецца для захоўваньня

малака і іншага пітва. Летам добра браць з сабой на працу малако, ваду. Малако не кісне, вада ў ім халодная.

Яшчэ ў мяне ёсць латка. Гэта гліняная міска, у якой тушылі бульбу, рыбу, агародніну.

У мяне на палічцы стаіць сіта. Як вы думаеце для гаго яно патрэбна? Яно патрэбна для прасейвання мукі, каб не было камочкаў, каб у муку трапіла больш кіслароду.

А яшчэ ў мяне ёсць ступка. Хто ведае для чаго яна? Мне яна патрэбна для таго, как змяльчаць прыправы.

Тут жа была і маслабойка. Можа хто-небудзь ведае як з ёй працавалі? У яе налівалі смятану і ўручную білі масла.

Некалі ў кожнай вясковай хаце былі начоўкі. У іх мылі бялізну і рыхтавалі мяса для каўбас. Старыя начоўкі выкарыстоўвалі ў гаспадарцы як карыта, з іх куры і гусі пілі ваду.

Вось тут каля печы ў мяне многа неабходных рэчаў. Гэта качарга, вілы. Усё гэта я выкарыстоўваю у паўсядзённым жыцці.

Выхавальнік: Вы нам так многа расказалі цікавага, можа трошкі пагуляем?

Прапаную гульню “Адгадай чый галасок”

Выхавальнік: Дзякуйвам, гаспадыня, за ваш расказ. Нам было вельмі цікава з вамі.

Гаспадыня: Дзеці, я вас хачу пачаставаць. У мяне на прыпечку стаіць для вас смачны пірог. Частуйцеся.

Выхавальнік: Дзякуй вам.